ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1988
ЧАЦВЕР
1
СНЕЖНЯ
№ 32(1590)

У наступным нумары чытайце:

— Мне ўпершыню давялося быць сведкай такога сур'ёзнага і, што самае галоўнае, самастойнага выступлення камсамольскай арганізацыі, у якім сапраўды глыбока і ўсебакова адлюстравана пазіцыя моладзі,— выказаў свае адносіны да публікацыі «Московского университета» «Наша пазіцыя» аспірант фізічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава А. Глазкоў.

Зразумела, выступленне ў газеце — толькі аснова для дыскусіі, якую распачаў камітэт камсамола Маскоўскага універсітэта.

ТАМУ, ПРАДСТАЎЛЯЮЧЫ ДЛЯ ПУБЛІКАЦЫІ ЎЛАСНУЮ ПАЗІЦЫЮ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА ПРАПАНУЕ ТАБЕ, ПАВАЖАНЫ ЧЫТАЧ, ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У ЯЕ АБМЕРКАВАННІ. ДАПАМОЖА Ў ГЭТЫМ АНКЕТА, ЯКУЮ МЫ ЗМЕСЦІМ ТАКСАМА Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ.

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

ВЫСТАЎКА АМЕРЫКАНСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

арганізавана фундаментальнай бібліятэкай універсітэта. На ёй прадстаўлена больш 700 экземпляраў кніг па тэхніцы, мастацтву, медыцыне, філасофіі і іншых галінах, перададзеных у дар нашаму універсітэту. Магчыма, вас таксама зацікавіла гэта інфармацыя, тады не марудзьце: сёння яшчэ не позна наведаць выстаўку (яна размешчана ў п. 210 галоўнага корпуса.

Арганізатары яе запэўнілі, што ў хуткім часе наведвальнікі бібліятэкі змогуць працаваць з экспануемымі выданнямі.

М. АНДРЭЕЎ.

ШМАТ ПЫТАННЯЎ

было зададзена лектару — кандыдату гістарычных навук М. Р. Насеніку пасля таго, як ён закончыў прамову.

Лекцыя насычана багатым фактычным матэрыялам, узятым з архіваў, глыбокімі ўласнымі вывадамі і разважаннямі. У ёй дакладчык спыніўся таксама на некаторых публікацыях у прэсе, перадачах па тэлебачанню, якія датычаць размовы аб «белых плямах» гісторыі.

— Многія сумняваюцца: ці патрэбна нам гэта праўда праз столькі гадоў? — гаварыў М. Я. Насенік. І тут жа сцвярджаў: — Так, патрэбна. Для таго, каб больш ніколі не паўтарыліся тыя страшныя часы, калі жыццё чалавека не каштавала нічога.

КУРГАТ МАРЦІН СЕРАНЕЙ,
студэнт аддзялення міжнароднай журналістыкі.

ЗАЎСЕДЫ Ў ПОШУКУ

новых форм арганізацыі студэнцкага будаўнічага руху камітэт камсамола універсітэта. Як дабіцца таго, каб гэты патрыятычны пачын зноў стаў такім? Як заахвоціць студэнтаў працаваць у мясцовых (а не выязных) атрадах? Чаму ў адных СА і маральны клімат выдатны, і працоўныя паказчыкі высокія, і грамадская работа на ўзроўні, а ў іншых самы звычайны канфлікт не могуць самі ўладкаваць? Над гэтымі і безліччу іншых пытанняў часта задумваецца намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па працоўнаму выхаванню В. Бойка. Вось і на пасяджэнні рэктарата, дзе разглядаліся вынікі летняга працоўнага семестра, ён паспрабаваў даць адказы на некаторыя з іх.

З. МІХНЕВІЧ.

УЛАДАЛЬНІК КУБКА СВЕТУ

па класічнай барацьбе, што праходзіў у Грэцыі,— студэнт геаграфічнага факультэта С. Дземяшкевіч.

В. РУДЗЯНКОЎ.

СЛОВА ГЕРОЮ ЗДЫМКА

Кліча лета

— Баюся не паспець,— даверліва тлумачыла Вольга чаму не згадзілася у чарговы раз працаваць у камітэце камсамола факультэта.

— Камісару і адначасова кіраўніку агітбрыгады загадзя трэба рыхтавацца да працоўнага семестра,— запэўніла і камандзір Ірына.

І, пераглянуўшыся, знайшлі трапныя словы, каб расказаць пра атрад «Расінка», які даверыў ім гэтыя адказныя пасады.

Не ўсё атрымлівалася адразу. А мы на лёгкае жыццё не спадзяваліся. Праўда, не ўяўлялі сабе нашу работу такой: мяшкі цэменту, вапнавы раствор, велізарныя бакі з фарбай. Ледзь варушыліся напрацаваныя за дзень рукі. Не верылася, што хутка настане час адпачынку. Гэта потым гаварылі нам словы ўдзячнасці і сакратар камсамольскай арганізацыі будтрэста, і дырэктар школы, якую адрамантаваў наш атрад — самы «дарослы» і вопытны на мехмаце. Ён рос пад пякучым сонцам Малдавіі, набіраў моц у Казахстане, Карэліі, Якуціі, Цюменскай вобласці.

Новыя сустрэчы, новыя знаёмствы, новыя песні — верныя спадарожнікі кожнага будатрада. Мінулым летам мы ўбачылі сібірскі край, даведаліся аб Саматлоры.

Памятаюць жыхары Лангепаса і выступленні нашай агітбрыгады, якая заняла першае месца на абласным конкурсе, і канцэрт, падрыхтаваны «Расінкай» да Дня будаўніка.

Мы навучыліся паважаць сваю і чужую працу, знайшлі новых сяброў. А калі надышоў верасень, мы не расталіся са сваёй «Расінкай» і чакаем новай сустрэчы з маладым горадам Лангепасам.

В. ПІНДРЫК,
І. ЧУМАКОВА,
студэнткі механіка-матэматычнага факультэта.

НА ЗДЫМКУ: студэнтка III курса мехмата Вольга Піндрык.

Фота С. ГРЫЦА.

НЕ Ў БРЫВО, А Ў ВОКА

«Патрабуецца «сталкер»

13. 10. 88.

Пасля доўгага чакання і паўторнага запытання рэдакцыі галоўны інжынер упраўлення дарожна-маставога будаўніцтва і добраўпарадкавання пры Мінгарвыканкоме М. С. Куксачоў, нарэшце, паведаміў, што «факты, змешчаныя ў матэрыяле, сапраўды маюць месца. Прычынай «зацягнуўшайся» рэканструкцыі маста па вуліцы Кастрычніцкай з'яўляецца нездавальняючае забеспячэнне матэрыяламі і тэхнікай. У хуткім часе мостабудаўнічае ўпраўленне № 6 прыступіць да разборкі аб'екта і яго рэканструкцыі».

Пакуль жа зрухаў у будаўніцтве маста яшчэ няма. Нават слядоў будаўнікоў не бачна. Спяць моцным зімовым сном пад цёплай снежнай коўдрай абломкі і будматэрыялы (якіх, дарэчы, не хапала), застыў на марозе трактар — паўсюдна пануе цішыня і спакой. Таму, здаецца, зноў давядзецца вярнуцца да гэтага нерухомага аб'екта, разбудзіць «маставікоў». Зрэшты, зацішша можа быць і перад боем. Магчыма, сапраўды неўзабаве на месце развернецца гарачы фронт работ.

НА ПРАЦЯГУ ДЗВЮХ ГАДЗІН АДКАЗВАЎ НА ПЫТАННІ СТУДЭНТАЎ І ВЫКЛАДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА У. І. ЛЕНІНА СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР Г. С. ТАРАЗЕВІЧ. СУСТРЭЧА З ІМ АДБЫЛАСЯ 24 ЛІСТАПАДА Ў АДНОЙ З АЎДЫТОРЫЙ ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА.

ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ — ЭКЗАМЕН НА ТВОРЧАСЦЬ

НА ВАЖНЕЙШЫХ праблемах, якія патрэбна будзе вырашыць у ходзе перабудовы, спыніўся Г. С. Таразевіч у сваім уступным слове, падкрэсліваючы, што краевугольным каменем з'яўляецца на сённяшні дзень эканамічная рэформа.

— Закон аб сацыялістычным прадпрыемстве,— адзначыў Г. С. Таразевіч,— вырашыў праблемы галіны па вертыкалі, а вось адносіны прадпрыемстваў рэгіёна і галіны ў ім не знайшлі дастатковага адлюстравання. Тут ён прабуксоўвае. І гэты прабел павінен быць ліквідаваны ў будучым годзе ў Законе аб мясцовым самакіраванні.

Калі глядзець на сённяшні стан спраў у нашай эканоміцы з пункту гледжання сацыяльнага — ясна, што поспехі тут больш чым скромныя. Вы гэта самі адчуваеце па асартыменту тавараў у нашых магазінах.

У гэтым годзе мы прадалі тавараў не менш, чым у мінулым, але становішча на рынку стала горш. Адна з прычын у тым, што дэбаты вакол рэформы цэн выклікалі пэўную псіхалагічную рэакцыю насельніцтва. Многае стала раскупляцца ў запас. І ў гэтым выпадку хацелася б яшчэ раз напомніць словы М. С. Гарбачова аб тым, што рэформа цэнаўтварэння будзе ажыццяўляцца, але не за кошт інтарэсаў савецкіх людзей.

Іншая справа, ці гатова да гэтага эканоміка? Не. Да цяперашняга часу дзейнічае сістэма цэнтралізаванага размеркавання большасці тавараў народнага спажывання па прынцыпу «ад дасягнутага». Такім чынам, для таго, каб забяспечыць у дастатку свае патрэбы, рэгіён, які вырабляе той або іншы від прадукцыі масавага попыту, вымушаны пастаянна выступаць у ролі прасіцеля сваёй жа прадукцыі. Становішча тут пачало ўжо мяняцца, а рэгіянальны гаспадарчы разлік дапаможа і далей рушыць наперад.

Думаю, што да канца года канкрэтныя шляхі пераходу будуць у асноўным ясныя. Складанасць у тым, як сумясціць інтарэсы рэгіёна з інтарэсамі галін і прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання, саюзных міністэрстваў і ведамстваў. Дарэчы, запрашаем прыняць удзел у гэтай рабоце і вас. Давайце створым, скажам, гарадскі клуб маладых эканамістаў. Бо калі разабрацца, такой катэгорыі спецыялістаў нам не хапае, асабліва пры вырашэнні нестандартных задач. Каб атрымаць важкія вынікі, эканамістам трэба сустракацца, разам весці пошук.

Г. С. Таразевіч закрануў таксама асноўныя аспекты палітычнай рэформы.

— Ніколі яшчэ не было такога зацікаўленага і сапраўды ўсенароднага абмеркавання важнейшых палажэнняў Асноўнага Закона нашай Радзімы,— падкрэсліў прамоўца.— Учора Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР падвёў вынікі абмеркавання, якое праходзіла ў рэспубліцы. У Прэзідыум паступіла звыш шасці тысяч канкрэтных прапаноў.

Аб чым у іх у найбольшай ступені ішла размова?

Аб парадку фарміравання вышэйшых органаў дзяржаўнай улады, вызначэнні паўнамоцтваў з'езда народных дэпутатаў, забеспячэнні незалежнасці суддзяў. Прапануецца, каб важнейшыя пытанні мясцовага жыцця вырашаліся толькі пасля папярэдняга абмеркавання з грамадзянамі.

Не засталіся абыякавымі людзі і да перамен у выбарчай сістэме. Больш за ўсё прапаноў, напрыклад, звязана з нормамі, якія рэгулююць вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты і перавядзенне выбараў.

На выбарах павінна быць забяспечана рэальная спаборнасць будучых дэпутатаў — такое патрабаванне выбаршчыкаў.

Яшчэ адно пытанне, на якое я хацеў бы звярнуць увагу іменна маладзёжнай аўдыторыі,— падкрэсліў на сустрэчы ва універсітэце Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.— Яно закранае ўзаемаадносіны пакаленняў. Мы мала думалі аб гэтым раней. Праблема ж вельмі сур'ёзная. Нядаўна я ўдзельнічаў у рабоце партыйнай канферэнцыі Савецкага раёна Мінска, дзе прыводзіўся такі факт: сярэдні ўзрост дацэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута — 51 год. (Ажыўленне ў аўдыторыі). Мала мы клапаціліся аб кар'еры моладзі ў самым добрым сэнсе гэтага паняцця. Малады спецыяліст — актыўны, думаючы — павінен бачыць перспектыву росту, яму трэба прадастаўляць такія магчымасці. Бо перабудова — гэта дастойная ацэнка творчых здольнасцей кожнага маладога чалавека. З гутаркі з кіраўніцтвам вашага універсітэта я зразумеў, што такая праблема існуе і ў вас. Не баючыся паўтарыцца, скажу, што моладзь — наша будучыня. Таму асноўныя клопаты партыі, каб патэнцыяльныя магчымасці юнакоў і дзяўчат выкарыстоўваліся максімальна.

Далей Г. С. Таразевіч адказаў на шматлікія пытанні.

ПЫТАННЕ: Студэнтам факультэта журналістыкі практычна няма дзе вучыцца: жывём не ў сваім будынку. Ці не маглі б Вы нам дапамагчы?

(Закончэнне на 2-й стар.).

ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Сховішча ведаў

У нашы дні нікога не здзіўляе, што ў час глабальных перамен, якімі жыве грамадства, амаль самым прывабным стаў «феномен гістарызму». Усе мы сведкі незвычайна ўзросшай цікавасці да айчыннай гісторыі. А ў справе ліквідацыі «белых плямаў», бадай, самую галоўную ролю іграюць першакрыніцы, рэдкая і каштоўная літаратура.

Адзін з параўнальна маладых аддзелаў фундаментальнай бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна — аддзел рэдкай і каштоўнай кнігі — адкрыты ў 1977 годзе. За адзінаццаць гадоў яго фонд вырас да 20 тысяч адзінак захоўвання: 10 тысяч — перыёдыка XVIII—XIX стагоддзяў, а астатняе — кніжны фонд, у які ўваходзяць выданні XVIII і (пераважна) XIX стагоддзяў. Сюды ж паступаюць на захоўванне лепшыя сучасныя выданні.

Гэты фонд лічыцца ўніверсальным. Тут ёсць літаратура па ўсіх галінах ведаў: філасофіі, гісторыі, марксісцка-ленінскай тэорыі, прыродазнаўчых навуках, мастацкая. Кнігі на многіх еўрапейскіх мовах, пачынаючы са старажытна-рускай; кнігі, якія выдаваліся яшчэ пры жыцці аўтараў, выданні факсімільныя, выданні шматтомныя, летапісы, манаграфіі — усіх не пералічыць.

У аддзеле рэдкай кнігі можна прачытаць і законспектаваць выдадзеныя ў мінулым стагоддзі працы Гегеля, Канта, Фейербаха, Ламаносава. Прадстаўлены тут творы класікаў марксізму-ленінізму — рэдкія прыжыццёвыя выданні У. І. Леніна, работы К. Маркса і Ф. Энгельса, якія выйшлі ў свет у пачатку XX стагоддзя, «Архіў К. Маркса і Ф. Энгельса» у пятнаццаці тамах.

Сабрана ў вялікай колькасці гістарычная літаратура: выданні па Старажытнай Грэцыі і Рыму, Сусветнай, Усеагульнай і Заходне-Еўрапейскай гісторыі, па гісторыі Расіі. Дастаткова назваць Поўны збор твораў рускіх летапісаў у 37-мі тамах, шматтомнае выданне «Гісторыя Расіі са старажытнага часу» С. М. Салаўёва, таксама шматтомныя выданні гісторыкаў Н. І. Кастамарава, Б. А. Ключэўскага, М. Н. Пакроўскага, прыжыццёвае выданне «Гісторыі дзяржавы расійскай» М. М. Крамазіна — кнігі, якая яшчэ ў XIX стагоддзі вытрымала восем выданняў.

Ёсць у аддзеле ўнікальныя гістарычныя матэрыялы, напрыклад, «Збор дзяржаўных грамат і дагавораў», выдадзены ў пачатку мінулага стагоддзя, «Рускі летапіс па Ніканаву спісу».

У час вайны загінула вялікая частка бібліятэчнага фонду: многія кнігі былі вывезены ў Германію, многія — спалены фашысцкімі акупантамі, захаваліся толькі адзінкавыя экземпляры.

Наш час адзначаны рэзкім павышэннем інтарэса грамадскасці да гісторыі сваёй дзяржавы, гісторыі партыі і народа. Перабудова ставіць перад намі мноства складаных задач і вырашэнне іх немагчыма без глыбокіх і дакладных ведаў гісторыі, лепшага вопыту ўсяго чалавецтва. Зараз ідзе зацікаўленае абмеркаванне закрытых раней тэм, адбываецца перасэнсаванне многіх падзей мінулага. Зразумела ў сувязі з гэтым і павышэнне інтарэсу да нацыянальнай культуры, мінулага сваёй рэспублікі.

У аддзеле паклапаціліся аб картатэцы, якая істотна аблегчыць пошук неабходнага матэрыялу. У яе занесены матэрыялы па гісторыі Беларусі, змешчаныя на старонках дарэвалюцыйнага друку.

Пералік выданняў аб Беларусі можна працягваць. Тут і «Акты Віленскай камісіі» у 37-мі тамах, і Беларускі архіў старажытных грамат, і Пісцовыя кнігі Пінскага і Клецкага княстваў, і Вопыты апісання Магілёўскай губерніі.

Карыстанне літаратурай аддзела мае свае цяжкасці. Зразумела, што рэдкія і каштоўныя кнігі на рукі не выдаюцца, ды і ў чытальнай зале працаваць з імі могуць толькі тыя, хто мае дазвол, карацей, тыя, хто выконвае нейкія навуковыя работы.

Дык як жа зрабіць, каб гэты каштоўнейшы матэрыял стаў агульнадаступным? Загадчыца аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі Лілія Паўлаўна Міцкевіч лічыць, што зрабіць гэта можна праз публікацыю ў прэсе больш поўнай інфармацыі аб літаратуры, якая складае фонд аддзела.

І. ДРАПУН,
Г. БОРТУЛЕВА,
студэнты факультэта журналістыкі.

НА ВАШУ КНІЖНУЮ ПАЛІЦУ

«РЫМ знішчыў Карфаген. Знішчыў варварскі, сцёршы з зямлі, з разлікам на тое, каб памяць аб былой славе Карфагена адышла ў мінулае. Усе павінны ведаць і памятаць толькі аб велічы Рыма. Але жорсткасць выклікала зваротны эфект: Карфаген на тысячагоддзі захаваўся ў памяці нашчадкаў».

Гэта цытата з кнігі кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ імя У. І. Леніна К. А. Равякі «Пунічныя войны» (Выдавецтва «Універсітэцкае», 1988 г.). У ёй упершыню ў айчыннай гісторыяграфіі ў адзіным комплексе даследуюцца ўсе войны Рыма з Карфагенам, якія адкрылі Рыму шлях да сусветнага панавання і знішчылі пунічную цывілізацыю.

РОДНАЯ МОВА

БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА? — ДА!

Курс XXVII з'езда КПСС і XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі на ўсебаковую дэмакратызацыю грамадскага жыцця краіны як нельга лепш садзейнічае ажыўленню нацыянальна-патрыятычнага руху ў рэспубліках. Набалелыя пытанні і праблемы нацыянальных моў, культурнай спадчыны і яе зберажэння, якія яшчэ нядаўна ўсяляк забараняліся і ў лепшым выпадку разумеліся пад «інш.», зараз стаяць як адны з найбольш вострых і злабадзённых.

Беларуская мова, якая, згодна афіцыйнай думцы, «дасягнула за гады савецкай улады небывалага росквіту», у наш час (70—80-я гады) аказалася на мяжы поўнага вымірання. Мова, якой у далёкія XV—XVII стагоддзі не грэбавалі карыстацца вялікія літоўскія князі, на якой выдаваліся першыя ўсходнеславянскія кнігі, складаліся і друкаваліся афіцыйныя паперы, вялося справаводства, раптам стала падчаркай у родным доме. І сёння даводзіцца гаварыць пра экстранныя меры па захаванню найдаражэйшага скарбу народа — яго мовы. Трывога за лёс беларускай мовы гучыць у шматлікіх артыкулах беларускіх пісьменнікаў, барацьба за беларускую мову стала адной з асноўных задач маладзёжных аб'яднанняў «Талака» і «Тутэйшыя». Аб стане вывучэння беларускай мовы і літаратуры ў нашай рэспубліцы добра сказана ў дакладзе тав. Я. Я. Сакалова на нядаўнім Пленуме ЦК КПБ. Вывад Пленума: становішча патрэбна неадкладна выпраўляць, калі мы хочам застацца нацыяй са сваёй мовай і адметнай нацыянальнай культурай.

У гэтай барацьбе належнае месца павінен заняць і наш універсітэт. Старэйшыя выкладчыкі БДУ добра памятаюць гады, калі ўсё навучэнне, за выключэннем некаторых аддзяленняў, вялося на беларускай мове. Беларускай мовай свабодна валодаў першы рэктар універсітэта, акадэмік АН СССР У. І. Пічэта, які вывучыў яе пры пераездзе ў Беларусь і ў далейшым удзяляў вялікую ўвагу прапагандзе і папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры. Сённяшні ж Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна ў плане выкарыстання беларускай мовы нічым не адрозніваецца ад іншых вышэйшых навучальных установаў рэспублікі. Акрамя шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт», асобных артыкулаў у «Весніку БДУ», а таксама шыльдаў на дзвярах — гэтым і вычэрпваецца прымяненне беларускай мовы. Праўда, ёсць яшчэ журфак і філфак — гэтыя сціплыя астраўкі ў рускамоўным акіяне.

Кожны чалавек як асоба пачынаецца з усведамлення свайго «я», з аднясення сябе да пэўнага тэрытарыяльнага аб'яднання, нацыі. Нацыянальная гордасць беларусаў, свабодалюбівы дух і няскоранасць перад любымі нягодамі дазволілі нашаму народу выстаяць і захавацца на працягу самых неспрыяльных перыядаў гісторыі. Пачуццё нацыянальнай гордасці дазваляе і сёння з упэўненасцю сказаць, што горшыя часіны засталіся ззаду, лепшае ў лёсе беларускай мовы наперадзе, яно ў нашых з вамі руках.

Пашырэнне і актыўнае ўкараненне беларускай мовы ў БДУ вырашыць толькі адміністрацыйнымі мерамі нельга. Патрэбна адзіная шырокая і ўсебаковая праграма беларусізацыі жыцця універсітэта. Застрэльшчыкамі такой праграмы павінны стаць рэктарат, партком, прафком і камітэт камсамола. Тым больш гэта неабходна, што існуе рэспубліканская праграма — «Асноўныя мерапрыемствы па далейшаму развіццю народнай асветы ў Беларускай ССР», якая была зацверджана бюро ЦК КПБ 27 верасня 1988 года.

Што нам бачыцца ў гэтай праграме? Найперш растлумачальная работа ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта, работа, накіраваная на ўсведамленне неабходнасці і абавязковасці вывучэння беларускай мовы, актыўнага (а не пасіўнага!) далучэння кожнага выкладчыка і студэнта да засваення духоўнай спадчыны беларускага народа, пошуку і адшукання свайго месца ў працэсе перабудовы вучэбнага і выхаваўчага працэсу ў БДУ. Першым крокам на шляху беларусізацыі з'яўляецца ўвядзенне 24-гадзіннага практычнага курса беларускай мовы для ўсіх студэнтаў універсітэта. Зараз такія курсы праводзяцца толькі на педагагічных спецыяльнасцях, чаго, зразумела, недастаткова. Такія курсы патрэбны не толькі студэнтам, але і выкладчыкам. Таму што ад іх у канчатковым выніку будзе залежаць поспех у нялёгкай на сённяшні час справе. Ужо зараз неабходна стварыць групы і калектывы па перакладу на беларускую мову падручнікаў і дапаможнікаў па ўсіх вучэбных курсах, падрыхтоўку новых спецкурсаў па тэрміналогіі ў той ці іншай галіне навуковых ведаў. Думаецца, сіламі адной кафедры беларускай мовы, якая працуе на філалагічным факультэце, тут не справіцца. Патрэбна агульнаўніверсітэцкая кафедра беларускай мовы для нефілалагічных спецыяльнасцей.

Беларуская мова ўжо зараз можа стаць рабочай мовай насценных газет, наглядней агітацыі на факультэтах і ў падраздзяленнях, пры правядзенні навуковых канферэнцый і чытанняў, сходаў, урачыстых пасяджэнняў і інш. Далучэнню студэнтаў і выкладчыкаў да беларускай мовы садзейнічае рэспубліканскі друк. У гэтай сувязі хацелася б бачыць на факультэтах і ў падраздзяленнях інфармацыйныя стэнды з такімі газетамі, як «Звязда», «Чырвоная змена», «Настаўніцкая газета», «Літаратура і мастацтва». У студэнцкіх групах можна арганізаваць секцыі інфарматараў, якія б штотыднёва знаёмілі ўсіх з найбольш цікавымі матэрыяламі ў беларускамоўных выданнях.

Значная частка нашых выпускнікоў накіроўваецца на работу ў беларускія школы. Весці навучанне дзяцей ім даводзіцца на беларускай мове. А мовы ж фактычна малады выпускнік універсітэта і не ведае. Таму неабходна на ўсіх факультэтах, дзе ёсць педагагічныя аддзяленні, уводзіць канкрэтныя віды заняткаў са школьнымі падручнікамі на беларускай мове, глыбей знаёміцца з патрабаваннямі школьнай праграмы да вывучэння адпаведных прадметаў з улікам нацыянальнай спецыфікі.

Зразумела, што адразу дабіцца карэннага пералому ў справе ўкаранення беларускай мовы ў навучальным працэсе ў БДУ нельга. Гэта — доўгая і карпатлівая работа, якая павінна нарэшце стаць у цэнтры вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай дзейнасці ўсіх без выключэння грамадскіх арганізацый, адміністрацыі. Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна павінен адпавядаць сваёй назве. Я — за! А вы?

М. ПРЫГОДЗІЧ,
дацэнт кафедры беларускай мовы.

НЕ ТОЛЬКІ ПАДРУЧНІК

— Навошта нам так падрабязна вывучаць гісторыю непрымірымай барацьбы двух рабаўладальніцкіх драпежнікаў — Рыма і Карфагена, якая працягвалася больш за стагоддзе (264—146 гг. да н. эры)? — спытаеце вы. І ўжо ва ўступным артыкуле да выдання, напісаным самім аўтарам, знойдзеце адказ:

— Не паўтарыць памылак мінулага, выкараніць з жыцця чалавечага грамадства войны — з гэтай мэтай прагрэсіўныя вучоныя свету зноў звяртаюцца да падзей самых разбуральных у старажытнасці войн Рыма з Карфагенам — пунічных войн.

К. А. Равяка ведаў, што даследаваць гісторыю гэтых далёкіх часоў будзе вельмі складана: звесткі давялося браць галоўным чынам з рымскіх першакрыніц, а яны ўтрымлівалі часам свой, далёка не аб'ектыўны пункт гледжання.

І ўсё ж аўтар не пабаяўся ўзяцца за гэту працаёмкую работу. Пазнаёміўшыся з кнігай, можна канстатаваць: даследаванне ўдалося (не сцвярджаю, магчыма, спецыялісты знойдуць тут спрэчныя моманты). У ім гісторыя ваеннага майстэрства рымлян і карфагенян прасочваецца ў цеснай узаемасувязі з сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі той эпохі, раскрываецца талент палкаводцаў Ганібала і Сцыпіёнаў.

Аўтар прыводзіць шмат павучальных прыкладаў са старажытнай гісторыі, цікава расказвае аб займальных сцэнах ваенных баталій і трагічных момантах. Усё гэта аргументавана матэрыялам крыніц, якія дайшлі да нашага часу.

Акрамя таго, кніга выдатна афармлена: у ёй шмат ілюстрацый, карт і схем. Два ўказальнікі: імянны, геаграфічных і этнаграфічных назваў — дапамогуць арыентавацца ў багатым інфармацыйным змесце. Істотную дапамогу ў вучэбным працэсе выкладчыкам-гісторыкам і студэнтам акажа спіс літаратуры, які ўтрымлівае першакрыніцы і даследаванні. Кніга будзе таксама карыснай усім, хто цікавіцца антычнай гісторыяй.

Дарэчы, каб набыць гэта выданне, не патрэбна ездзіць па кнігарнях горада — дастаткова наведаць кніжны кіёск галоўнага корпуса.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ — ЭКЗАМЕН НА ТВОРЧАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

АДКАЗ: Развіццё матэрыяльнай базы універсітэта, на жаль, ідзе дрэнна. Рэктар сказаў мне, што адпаведная пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў рэспублікі рэалізуецца не ў поўнай меры. Пытанне гэта мы возьмем на контроль.

ПЫТАННЕ: Растлумачце, калі ласка, сітуацыю з будаўніцтвам новай АЭС на Віцебшчыне?

АДКАЗ: Аб будаўніцтве АЭС у Віцебскай вобласці размовы не было наогул. Было толькі рашэнне аб правядзенні даследчых работ. У друку апублікавана растлумачэнне па гэтаму пытанню, у якім ЦК КПБ і Саўмінам БССР адназначна сказана аб спыненні праектна-даследчых работ. Дарэчы, на месцы будуемай пад Мінскам АЭС будзе ўзведзена магутная цеплаэлектрацэнтраль, якая будзе працаваць на газе.

ПЫТАННЕ: Колькі прадукцыі сельскай гаспадаркі вывозіцца за межы рэспублікі, у прыватнасці, мяса, малака?

АДКАЗ: Мы атрымліваем на душу насельніцтва ў рэспубліцы 110 кілаграмаў мяса ў год. Спажываем 71. У краіне на аднаго чалавека спажываецца мяса крыху больш шасцідзесяці. А ёсць рэспублікі, дзе на аднаго чалавека прыпадае 30 кілаграмаў. Малака ў нас адпаведна атрымліваецца 717 кілаграмаў, спажываем больш як 400, што значна вышэй усіх біялагічных норм для гэтага прадукту. Натуральна, лішкі мы пастаўляем у іншыя рэгіёны. Атрымліваючы ўзамен тое, чаго не маем самі. Гэта зусім нармальна. Тое ж самае і па бульбе.

ПЫТАННЕ: Чаму Закон аб мітынгах носіць дазвольны, а не рэгіструючы характар?

АДКАЗ: У большасці краін свету, у тым ліку капіталістычных, гэты закон носіць іменна дазвольны характар. Больш таго, у многіх з іх пытанні аб правядзенні мітынгаў і дэманстрацый вырашаюцца органамі правапарадку, а не мясцовымі ўладамі.

ПЫТАННЕ: Ці будуць студэнты прызывацца ў рады Савецкай Арміі? Як вы адносіцеся да гэтага?

АДКАЗ: Студэнты з'яўляюцца грамадзянамі Савецкага Саюза, адпаведна ўсе абавязкі грамадзян СССР распаўсюджваюцца і на іх.

ПЫТАННЕ: Ці рэальна праграма забеспячэння ўсіх сем'яў кватэрамі да 2000 года? Чаму нічога не чуваць аб аб'яўленым раней рашэнні аб будаўніцтве індывідуальнага жылля ўМінску?

АДКАЗ: Выкананне праграмы «Жыллё 2000» ідзе з вялікім напружаннем. Яна і сёння не стала менш складанай. Пакуль мы лічым тэмпы выканання праграмы нездавальняючымі. Індывідуальнае будаўніцтва ў прыгарадах Мінска будзе весціся. Яно звязана з забеспячэннем пасёлкаў усімі неабходнымі камунікацыямі і інфраструктурай. У многіх прадпрыемстваў, якія сталі заказчыкамі, ужо ёсць спіскі тых, хто будзе жыць у першых чатырох пасёлках. Так што многае залежыць ад пазіцыі кіраўніцтва універсітэта. У раёне Шчомысліцы, дзе ўзводзяцца новыя карпусы БДУ, маглі б размясціцца дамы для прафесарска-выкладчыцкага саставу. Гэта ініцыятыва ў вашых руках.

ПЫТАННЕ: Як вы адносіцеся да таго, каб абавязаць дэпутатаў праводзіць рэгулярныя публічныя выступленні?

АДКАЗ: І дэпутаты, і кандыдаты ў дэпутаты абавязкова павінны выступаць перад насельніцтвам. Без гэтага рэформа выбарчай сістэмы бяссэнсавая. Вельмі правільная прапанова. Я ў гэтым годзе, напрыклад, правёў шэсць такіх сустрэч. Ды і гэта праходзіць у саёй акрузе, так што я сустракаюся з вамі перш за ўсё як ваш дэпутат.

ПЫТАННЕ: У рэспубліцы даўно наспела неабходнасць стварэння спецыялізаваных школ-інтэрнатаў з паглыбленым вывучэннем фізікі, матэматыкі, хіміі і іншых дысцыплін. Адну з іх можна было б арганізаваць і пры універсітэце.

АДКАЗ: Я цалкам падтрымліваю такую ідэю. Думаю, што трэба больш настойліва і мэтанакіравана дабівацца яе хутчэйшага ажыццяўлення, што ў многім залежыць і да тых, хто прысутнічае тут.

Г. С. Таразевіч адказаў і на іншыя пытанні, якія датычаць эканамічных, сацыяльных бакоў жыцця рэспублікі. Многія з іх прыняты ў якасці крытычных заўваг і прапаноў. Яны будуць перададзены ў адпаведныя ўрадавыя інстанцыі для канкрэтных рашэнняў.

Я ЛІЧУ, ШТО...

Нататкі на палях

Асабістыя ўражанні ад праграмных дакументаў грамадскіх рухаў Прыбалтыкі і некаторых самадзейных груп г. Мінска

БЕЗУМОЎНА, нельга не згадзіцца з прыамбулай гэтых дакументаў, як правіла, прысвечанай сацыяльна-палітычным і эканамічным вынікам перыяду панавання адміністрацыйна-камандnай сістэмы кіравання грамадствам СССР. Правільна падкрэсліваецца, што «толькі глыбокія дэмакратычныя змены ў эканоміцы, культуры, нацыянальнай палітыцы, ахове навакольнага асяроддзя, ва ўсім грамадскім жыцці дазволяць разлічваць на вартую чалавека будучыню». (Агульная праграма Народнага фронту Эстоніі).

Асабліва адзначаецца, што ў адказ на рэвалюцыйныя змены, пачатыя ў СССР «зверху», неабходна паўсюдная актывізацыя сустрэчных сацыяльных ініцыятыў, грамадскіх рухаў.

Мэтай і пафасам стварэння Народнага фронту абвяшчаецца дасягненне прынцыпаў рэальнага народаўладдзя ў процівагу існаваўшаму кіраванню «ад імя народа». Мяркуецца іменна такім чынам забяспечыць стварэнне ў СССР прававой дзяржавы і даць іменна Саветам рэальную палітычную ўладу на месцах ва ўсіх сферах грамадскага і эканамічнага жыцця.

Як правіла, ідэйным фундаментам грамадскіх рухаў аб'яўляюцца «агульначалавечыя каштоўнасці, дэмакратыя і плюралізм» (гл. Праграму НФЭ). Як ідэя, што згуртоўвае людзей, гэты тэзіс не можа не выклікаць даверу. Аднак дзеля справядлівасці патрэбна адзначыць, што як праграмнае палажэнне, разлічанае на перспектыву, ён не зусім удала стыкуецца з двума (нават на самы першы погляд) іншымі фрагментамі праграмнага характару.

Па-першае, у праграмах расплыўчата вызначаюцца заканадаўчыя гарантыі поўнага захавання правоў некаторых некарэнных нацыянальнасцей гэтых рэспублік. Усе (ці амаль усе) яны залічваюцца ў катэгорыю «мігрантаў», гэта значыць людзей, мякка кажучы, без Радзімы і ўласных каранёў. Забываецца тое, што ў свой час гэтых людзей запрашалі на працу ў гэтыя рэспублікі, яны нямала зрабілі для падняцця эканамічнага і тэхнічнага ўзроўню даных рэспублік. І тыя працэсы, якія зараз разгортваюцца ў шэрагу раёнаў (абмежаванне правоў асоб некарэннай нацыянальнасці), не могуць не трывожыць. Наўрад ці можна лічыць нармальнай сітуацыю, калі паралельна з «народнымі франтамі» пачынаюць фарміравацца і «інтэрнацыянальныя грамадскія рухі». Існаванне розных этнічных асаблівасцей у межах усіх саюзных рэспублік — гэта гістарычная з'ява і, безумоўна, не можа не хваляваць раскол (няхай нават патэнцыяльны) па гэтай прыкмеце. Гэта будзе крокам назад нават у параўнанні з дэмакратыямі заходняга ўзору. На ўстаноўчым сходзе Літоўскага руху за перабудову першы сакратар ЦК КПЛ А. Бразаўскас праўдзіва адзначаў, што «мы ніколі не будзем падтрымліваць ніводнага грамадскага фарміравання, якое зробіць спробу падтрымліваць нацыянальную адасобленасць або замкнутасць, а тым больш — падазронасць або нецярпенне да іншых народаў» (Советская Литва, 1988, 23 кастрычніка). Тым не менш, пакуль не зусім зразумела, якія заклікі будуць пераважаць на першым часе.

Па-другое, праграмныя дакументы НФЭ справядліва бічуюць ўраўнаванне ранейшага прынцыпу размеркавання і заклікаюць да таго, каб, напрыклад, «кожны грамадзянін Эстонскай ССР меў магчымасць максімальнага выкарыстання сваіх сіл пры ўмове канкурэнцыі ў любой «адвольна выбранай сферы дзейнасці, атрымліваючы справядлівую плату за работу...» Для гэтага, у прыватнасці, дапускаецца як прынцып (а не як часовая эканамічная мера, што агаворваецца асобна) прыватная уласнасць на сродкі вытворчасці, а таксама магчымая перадача дзяржаўных прадпрыемстваў на дагаворнай аснове працоўным калектывам, кааператывам, грамадскім арганізацыям і прыватным асобам. Не зусім зразумела, ці з'яўляецца гэта мера чымсьці прынцыпова пераўзыходзячым закон аб маёмасці, які ўжо рыхтуецца ў СССР. Не высветлена, што ўсё ж рабіць з эксплуатацыяй чалавека чалавекам, якая непазбежна ўзнікае ў гэтай сістэме адносін і якую, дарэчы, не адмаўляюць спецыялісты сучаснага Захаду. Гаворка звычайна ідзе аб больш ці менш эфектыўных рэцэптах яе змякчэння. Зразумела, што эксплуатацыя чалавека дзяржавай (сталінскі сацыялізм) у шэрагу выпадкаў — яшчэ больш пячорны варыянт, відавочна, што «проста так» эканамічную годнасць чалавека не выхаваеш. Але гэта не рашэнне праблемы, улічваючы, што сацыялізм — гэта магчымасць працаваць на сябе, і ісці назад ад гэтага прынцыпу, не даказаўшы яго эканамічную неэфектыўнасць (гэта недаказальна, таму што зараз мы толькі маем шанц пабудаваць гэту сістэму), наўрад ці апраўдана. Таму палажэнне аб «агульначалавечых каштоўнасцях» Народнага фронту можа ў будучым сутыкнуцца з сур'ёзнымі цяжкасцямі.

Ідэя рэспубліканскага гасразліку, паступова пераходзячага ў эканамічную і палітычную самастойнасць,— ідэя неадназначная. Тым не менш, заўважым, што паколькі Эстонія імкнецца ў будучым арыентавацца на навукаёмкую вытворчасць, то дадзены шлях наўрад ці можна лічыць эканамічна абгрунтаваным, таму што кошт патэнтаў на сусветным рынку пастаянна расце, а таннай рабочай сілы ў Прыбалтыцы няма і не прадбачыцца, што выключае паўтор японскага шляху, тым больш, што Японія ўжо існуе. Так, ранейшая каардынацыя Прыбалтыкі з саюзнымі НДІ для распрацоўкі дарагіх навуковых праграм была неэфектыўнай. Але пераход на свой, замкнуты цыкл такіх даследаванняў,— ці магчымы ён? А без НТП дадзены фрагмент праграмы як і яўнае (або няяўнае) патрабаванне выйсці на ўзровень сусветных стандартаў на «уласным тэхналагічным плацдарме» і забеспячэнне сваёй (у будучым верагодна свабодна канверціруемай валютай) не здаецца гэтак лёгка дасягаемым.

Немалаважна і тое, што гасразлік — гэта эквівалентны тавараабмен з абодвух бакоў. Нядрэнна арыентавацца на экалагічна чыстыя вытворчасці (навука, жывёлагадоўля), разлічваючы на тое, што іншыя вытворчасці (здабыча свінцу, напрыклад), якія нідзе ў свеце не навучыліся ажыццяўляць без істотных экалагічных затрат, возьме на сябе чалябінскі, запарожскі або салігорскі пралетарый. Але хіба немагчымы варыянт, што, скажам, Эстоніі давядзецца ў будучым самой, па ўласнай ініцыятыве, пад націскам канкурэнцыі ўжо не з братам-рабочым з Беларусі ці Ленінграда, а з транс-нацыянальнымі карпарацыямі распрацоўваць з мінімальнымі затратамі, максімальна танна свае сланцы. Як тады? Ці ўсё так проста?

Дэмакратызацыя як працэс і дасягненне сацыяльнай справядлівасці прадстаўлены вельмі шырока. Усё гэта, безумоўна, можна вітаць: і адмену папярэдняй цэнзуры і ўсялякіх незаслужаных прывілегій, і ўпарадкаванне набору ў СА, і парадку праходжання воінскай службы, і рэальнае забеспячэнне свабоды слова і друку, на радыё і тэлебачанні. Але... Захад за сваю дэмакратыю заплаціў, па-першае, не адным дзесяцігоддзем суровай школы барацьбы за яе, школы парламентскіх форм вядзення барацьбы думак, барацьбы палітычнай. У нас жа часта і «ультра-правыя», якія сумуюць па сталінізму, і «левыя», жадаючыя «устроіць ім усім», аднолькава схільныя да «сілавых метадаў вядзення барацьбы» з апанентамі. І поўная свабода выказвання думак неблагая, калі маюцца масавыя дэмакратычныя традыцыі ў глыбіні народа. Успамінаю Вальтэра: «Я ненавіджу вашы прынцыпы, але гатовы аддаць жыццё за ваша права іх выказваць». Ісці да гэтага максімальна хутка неабходна, але мець магчымасць рэальна прысячы ўзнаўленне сумгаіцкіх традыцый, мне здаецца, вельмі важна. І не патрэбна забываць, што пры дэмакратыі палітычнай (з пэўнымі праблемамі, безумоўна) Захад не вельмі многага дасягнуў у дэмакратызацыі эканомікі. Успомнім правал праграмы ажыццяўлення «індустрыяльнай дэмакратыі». Нашы спробы ад тэрору і ў палітыцы, і ў эканоміцы праз карупцыю і расхлябанасць і ў тым, і ў другім перайсці да дэмакратычнага цэнтралізму ў абедзвюх гэтых сферах бачацца больш складанымі, чым здаецца на першы погляд.

У цэлым неабходна падкрэсліць, што ў любым выпадку тыя тэндэнцыі ў праграмных дакументах новых грамадскіх рухаў у СССР, якія закліканы ажыццявіць лозунг «больш сацыялізму!» неабходна ўсяляк вітаць (асабліва выпрацоўку рэальных механізмаў грамадскага кантролю і «ціску» на бюракратыю). Не мае патрэбы, безумоўна, акцэнтаваць увагу на абавязковасць перапісвання прыбалтыйскіх «сцэнарыяў» у іншых рэгіёнах СССР. Сэнс перабудовы заключаецца, на маю думку, у тым, каб пазбегнуць нівеліравання сацыяльна-эканамічных і палітычных працэсаў у розных раёнах краіны пры арыентацыі на агульныя мэты.

І, напэўна, толькі практыка зможа пераканаць у тым, якія перспектывы больш верагодныя: агульнанародны фронт барацьбы за перабудову — фронт, які выхоўвае, аб'ядноўвае людзей, ці рухі, што раздзяляюць грамадства па этнічным прыкметам,— тое, што недапушчальна. Асабіста я лічу патрэбным таксама ўлічваць як магчымую перспектыву поўнае адраджэнне ленінскага стылю кіраўніцтва партыяй — сапраўднага дэмакратычнага цэнтралізму з неабмежаваным плюралізмам меркаванняў.

У любым выпадку неабходна дэталёва абдумваць мадэлі палітызацыі (гэта і ёсць дэмакратызацыя) нашага грамадства. Эксперыменты на людзях у нашай гісторыі былі. Паўтараць іх немагчыма ні пад якімі лозунгамі.

А. ГРЫЦАНАЎ,
кандыдат філасофскіх навук, в. а. дацэнта кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.

ЗДАРЫЛАСЯ Ў ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

З САМАВАРАМ І СЯКЕРАЙ

РАПТАМ на сцэне з'явіліся дужыя хлопцы, апранутыя ў старадаўнія шляхецкія чырвоныя світкі. Адзін з іх трымае ў руках самавар, другі — ...сякеру. Так незвычайна пачалі сваю «праграму» студэнты механіка-матэматычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта на вечары, прысвечаным Міжнароднаму дню студэнтаў.

Гэтыя немудрагелістыя рэчы сталі своеасаблівай сімволікай свята, бо шчырасць, лагоднасць і разам з тым вострая крытыка некаторых з'яў нашага жыцця вызначалі выступленні гаспадароў сцэны — студэнтаў мехмата нашага універсітэта.

Што спадабалася б вам? Адразу ж ліхаманкава «праглядваю» нумары. Магчыма, ансамбль эстраднай пародыі «Бух-Бах». А таксама хор «Дуб». Доўга не адпускалі за кулісы калектыў «акцераў» гістфака, які паказаў невялічкі ўрывак з жыцця студэнтаў «Непаразуменне», працяглыя апладысменты гледачоў.

І не дзіўна, што адразу пасля вечара і назаўтра ў аўдыторыях мехмата ішло гарачае абмеркаванне падзеі, выказваліся непрытоеныя захапленні ўбачаным. А тыя, каму не пашэнціла пабываць у зале, пэўна, пашкадавалі. Зрэшты, і іх можна абнадзеіць. 24 красавіка наступнага года гродзенскія студэнты абяцалі прывезці новую праграму.

Г. ТАПТУНОВА,
студэнтка I курса факультэта журналістыкі.

Фота С. ГРЫЦА.

Таленты сярод здольнасцей

— А вы добра разумееце, што значыць сёння талент? — спытаў нас дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі прафесар А. М. Шырокаў.— Уяўляеце, з пачатку года з факультэта адлічана больш 30 чалавек, у асноўным за непаспяховасць. І не заўсёды вінаватыя ў гэтым студэнты. Устарэла зафармалізаваная сістэма вышэйшай адукацыі, што дзейнічала на працягу многіх гадоў. Класічная форма вядзення заняткаў (лекцыя — семінар) ужо не задавальняе будучых спецыялістаў. Да таго ж працэс навучання на нашым факультэце ўскладняецца тым, што мы не маем пастаянных вучэбных дапаможнікаў. Нават мінулагоднія прыходзяць у нягоднасць. Але справа не столькі ў кнігах ці ў кабінетным засваенні прафесарскіх канспектаў, а ў рэальным выкарыстанні тэорыі на практыцы. Наша навука патрабуе, каб нішто з засвоенага не засталося голай тэорыяй. Для барацьбы за поўнае ўзаемадзеянне тэорыі з практыкай неабходна воля, накіраваная на мэту. Лічу, гэта і ёсць талент.

Праўда, такому матэрыяльнаму, чыста «тэхнічнаму» вызначэнню можна запярэчыць. Дзе ўзнікаюць вытокі таленту? Моцарт быў таленавіты з нараджэння. Ігра на раялю ніколі не была для яго сур'ёзнай працай. У сем гадоў, калі яго непасрэднае дзіцячае выкананне пакарыла Вену, ён не меў яшчэ асаблівай волі, ды і сур'ёзных жыццёвых мэт таксама. Моцарт меў дар, які развіваў у ім яго бацька — чулы і мудры настаўнік.

— Ва ўсіх групах нашага факультэта я ўпэўнены, бо займаюся з імі як і ўсялякі педагог,— добразычліва ўсміхаецца А. М. Шырокаў.— Без перабольшання магу сказаць: у асабліва таленавітай пятай групе студэнты могуць працаваць па дванаццаць гадзін у суткі, хоць яны — звычайныя будучыя радыёфізікі, а не Паганіні. А што? Хіба гэта мяжа магчымасцей маладых? Я займаюся і з такімі, хто пасля пятага курса адразу абараняў кандыдацкую дысертацыю.

Якімі ж павінны быць гады, праведзеныя ў ВНУ? Як зрабіць іх больш плённымі, насычанымі?

— Думка будучых спецыялістаў і выкладчыкаў адназначная: недзе на палове трэцяга курса студэнт павінен адчуваць цягу да самаадукацыі. З жаданнем мысліць, разбірацца самому. У нашай пятай групе гэта ёсць і зараз.

Усе мае лекцыі аддрукаваны на машынцы. Не наведаў лекцыю — можаш прыйсці пазнаёміцца з ёю ў любы час. Складаней з практыкай. Ведаеце што,— задумаўся дэкан,— падрыхтуемся і два разы ў тыдзень будзем праводзіць заняткі ва універсітэцкіх навукова-даследчых інстытутах. Будзем вучыцца, працаваць, даследаваць, распрацоўваць.

Шлях да даследчай работы няпросты. Пачынаецца ён з вузенькай сцяжынкі дзелавога жадання, што вядзе да далёкага, прывабнага агеньчыка — цікавасці. Усё ў свеце рухае цікавасць.

Неяк аднойчы, з'ездзіўшы на сельскагаспадарчыя работы, рабяты вылічылі, што каэфіцыент карыснага дзеяння атрымаўся толькі 10 працэнтаў. Не вышэйшым аказаўся ён і ў паўсядзённай вучобе. Жаданне падтрымаць гонар роднага факультэта прымусіла асістэнта-наватара А. С. Пятраева заняцца адборам асабліва адораных у фізіцы і матэматыцы абітурыентаў у пятую групу. Недзе ж неабходна рыхтаваць спецыялістаў для такіх рэдкіх галін народнай гаспадаркі і нацыянальнай навукі, як, напрыклад, атамна-малекулярная энергетыка. Без гэтага сёння немагчыма.

Але і тут былі непаразуменні. Некаторыя пераконвалі, што вылучаць нейкую асобную групу нельга, бо гэта прынізіць астатніх. Але я з гэтым не згодзен. Па-першае, таленты ўсюды — гэта гонар, няхай сабе на прадпрыемстве, у ПТВ, тэхнікуме. Па-другое, да тых, у каго ўзровень падрыхтоўкі вышэйшы, патрабаванні ў нас таксама павінны быць большымі. Безумоўна, яны хутчэй справяцца з заданнямі і змогуць атрымаць новыя.

Вернемся крыху назад. Адбор пачаўся. У газеце «Знамя юности» і часопісе «Квант» надрукавалі ўмовы конкурснай алімпіяды. Зрабіць 20 конкурсных задач было прапанавана дзесяцікласнікам 1-й Брэсцкай, 50-й і 16-й Мінскіх сярэдніх школ. Прычым, тых, хто асіліў хоць дзве-тры, адразу ж запрашалі на гутарку ў БДУ. У асноўным гэта былі выдатнікі.

Правялі адбор і (любое наватарства падпільноўваюць цяжкасці) у нашым універсітэце згадзіліся вучыцца толькі нямногія таленты. Астатнія аддалі перавагу больш прэстыжнай установе — Маскоўскаму фізіка-тэхнічнаму інстытуту. Здаралася і так, што абітурыентам, якія валодалі ўнікальным дарам, але не мелі фармальнага мэтавага накіравання, на факультэце не знайшлося месца.

Залічаныя ў пятую групу, запэўнім, не будуць мець ніякіх прывілей пры размеркаванні. З аднолькавым поспехам яны могуць быць накіраваны як у раённы цэнтр, так і АН БССР. З адной толькі розніцай: працаваць яны змогуць усюды.

Кожны дзень у групе па восем гадзін заняткаў. Нават калі захварэе выкладчык, яны не крычаць «ура» магчымасці «сачкануць», а займаюцца справай. Як і ўсюды, тут ёсць свой лідэр, баявы, гаваркі хлопец.

— Расслабляцца, гультайнічаць мы не маем права,— упэўнена паглядзеў на таварышаў другакурснік Мікалай Забела.— Чым канкрэтна будзем займацца пасля заканчэння, яшчэ ўяўляем не зусім дакладна. Адно ведаем цвёрда: за нас сорамна не будзе. Мы абавязкова пастараемся сказаць сваё слова ў навуцы. Рана ці позна. Праўда, гэта пад сілу толькі мэтанакіраваным людзям. Як хацелася б быць у іх ліку!

А. ТАТАРЫНАЎ,
М. ЛЯБЕДЗІК,
студэнты I курса факультэта журналістыкі.

ВУЧАЦЦА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ

У гэтым годзе Дзяржкамітэт па народнай адукацыі выдаў загад № 217 «Аб прыцягненні да восеньскіх палявых работ студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і сярэдніх спецыяльных устаноў». Ён даў студэнтам права не выходзіць на работы, не звязаныя з уборкай ураджаю, у выпадку адсутнасці фронта работ, належных умоў працы і быту неадкладна ўзнімаць перад мясцовымі органамі пытанне аб вяртанні на заняткі.

З АФІЦЫЙНАЙ ДАВЕДКІ: «Сельгасатрады універсітэта працавалі ў Клімавіцкім, Краснапольскім, Круглянскім, Слаўгарадскім, Асіповіцкім, Шклоўскім, Чавускім раёнах Магілёўскай вобласці і ў саўгасе «Дрычынскі» Пухавіцкага раёна. Не толькі на «бульбе». Займаліся чысткай збожжа, уборкай камянёў. Амаль усе гаспадаркі ў першыя 10—12 дзён не змаглі поўнасцю забяспечыць студэнтаў работай. Кіраўнікі гаспадарак імкнуліся вырашыць свае праблемы колькаснымі метадамі. У той жа час аб'ём работ, на якія студэнты страцілі месяц, можна было б выканаць значна меншай колькасцю працуючых і ў больш кароткія тэрміны».

Загад загадам, а на месцах, як бачыце, мала хто ставіцца да яго належным чынам. Як выправіць становішча?

Я — СУПРАЦЬ

СТУДЭНЦКАЙ БУЛЬБЫ. РАСТЛУМАЧВАЮ ЧАМУ:

Ой, бульба, даражэнькая ты наша кармiліца. Што ні год, то ўсё даражэй. Студэнт, як вядома, вельмі танная працоўная сіла. Але непрадукцыйная. Што чакае яго ў полі? Ручная праца. Цяжкая, няўдзячная. За якую атрымліваюць капейкі. Не дзіўна, што неахвотна выконваюць яе самі калгаснікі. А механізацыя? Камбайны і капалкі часцей псуюцца, чым працуюць.

Калгаснік на ўласных сотках на адным і тым жа месцы збірае бульбу тры разы: выкапае, пераарэ поле і забараную. Колькі бульбы зімуе ў радках, калі капаюць яе студэнцкія рукі, толькі гаспадар падлічыць можа. Гаспадару (калгасу) — не да падлікаў.

А варта было б звярнуць увагу на тое, у якую капейку абыходзіцца нам сённяшняе гаспадаранне на бульбяным полі. І не забыцца б пра зарплату выкладчыкаў (кандыдатаў навук і прафесараў), якія атрымліваюць неафіцыйны адпачынак яшчэ на месяц. А таксама стыпендыю студэнтаў. Калі ўсё разам падсумаваць, каштавала б тая бульба ў магазінах не танней, чым мараканскія апельсіны.

Дарэчы, хто ведае, колькі выкапанай бульбы гіне, пакуль дойдзе яна да спажыўца? Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць: ад 30 да 50 працэнтаў. Можа, намнога эфектыўней сеяць на палову менш, а выкапаны ўраджай цалкам захоўваць? І адмовіцца ад несумленных рэкордаў па колькасці.

А студэнты... Час зразумець, што яны не прыгонныя сяляне, якіх можна выкарыстоўваць, як уздумаецца.

І. ШАЎЧУК,
студэнт.

ЖАДАЕЦЕ НА ПРАЦУ?

ІРАНІЧНА І НАСЦЯРОЖАНА ЎСМІХНУЛАСЯ КІРАЎНІЦТВА: СТУДЭНТЫ РАБІЛІ ЗАМАХ НА «ПАРАДАК» У КАЛГАСЕ

І яны, запісы, гэту засмучанасць пацвердзяць.

«Дні пагодлівыя. Слухаць «аб'ектыўныя» адгаворкі, як у мінулыя дні, проста смешна.

22.09. Да абеду працавалі паўтары гадзіны. Пасля — тры камбайны абслугоўвала адна машына, таму бульба «спынілася на начлег» у бункерах.

Вялі размову з кіраўніцтвам: у студэнтаў душа баліць, старшыня спасылаецца на ўласную занятасць.

23.09. У 11.15, нарэшце, «вызвалілі» учарашнюю бульбу. Пачалі працаваць. У 12.55 механізатары спяшаюцца абедаць. Вынік дня: працавалі тры камбайны, нагрузілі тры машыны. Пры нашай працаздольнасці маглі б 10—12, калі не больш.

24.09. Дзесяць гадзін раніцы. Да гэтае пары не можам выехаць у поле. На наша існаванне забыліся.»

Ні ў парторга, ні ў старшыні калгаса імя У. І. Леніна Чавускага раёна справа далей кіўка згоды з пералічанымі заўвагамі не ішла.

Студэнты — з'ява часовая. Перажывуць і ў памяшканні былой школы, без вады; вытрымаюць і скаргі бабулек (яны прытулілі палову атрада) на недахоп паліва. Абыдуцца без нармальных страў.

Як і спадзявалася кіраўніцтва, на «небытавыя» умовы студэнты не зважалі. Яны прыехалі працаваць. Дзіўна, але і права на дапамогу для першакурснікаў механіка-матэматычнага факультэта аказалася лімітаваным. А выдзелены фронт работ (з якім, дарэчы, па папярэдніх разліках самі калгаснікі не справіліся б) выглядаў як гаспадарская ласка. У першы тыдзень кінулі студэнтаў на барацьбу са смеццем у сельскім клубе, «пагрузачна-разгрузачныя» работы ў бібліятэцы. Потым перыядычна забяспечваліся працай 20 чалавек з 49. Ды й тыя... Чаго, здавалася б, прасцей — даць студэнтам вёдры для збору бульбы, што засталася ў зямлі. Але свае правілы існавалі і тут: выкапай і закапай на другой баразне.

Падлічыць мышэй, што бегалі па столі ў жыллёвым памяшканні, нават у матэматыкаў здольнасцей не хапіла, але падсумаваць разам тыдзень, калі ў поле не выходзілі, дні, калі працавалі па чатыры гадзіны, нерацыянальныя заданні здагадаліся. Працавалі, як трэба, як настройвалі сябе самі, каля дзесяці дзён. Адбывалі тэрмін сельскагаспадарчых работ месяц. Сумная арыфметыка матэрыяльнага ўрону. А быў яшчэ і маральны: што ні кажыце, а непрыемна адчуваць, што калгас, запрасіўшы, у тваёй дапамозе патрэбы не маеш і праблемы, развіцця сельскай гаспадаркі, нягледзячы на ўсе намаганні, вырашацца невядома калі.

А пакуль...

— Неабходны кантроль з боку адміністрацыі універсітэта, Дзяржкамітэта па народнай адукацыі БССР, партыйных органаў. Не пашкодзіла б, правёўшы даследаванне стану спраў у калгасах, нараду з кіраўнікамі сельскагаспадарчых атрадаў, вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці накіравання студэнтаў на сельгасработы за кошт заняткаў,— пералікам прапаноў М. С. Гарашчука і яго спадзяваннем на тое, што перамены абавязкова адбудуцца, і заканчваю матэрыял. Засталося дачакацца адказу.

НІ САБЕ, НІ КАЛГАСУ...

ЗАГУБЛЕНЫ ЧАС — ВЫНІК ПРАЦОЎНАГА МЕСЯЦА.

А мы ўсё даказвалі яму. Што кожнадзённае трохкіламетровае падарожжа на месца працы (пешшу) толькі парушае нармальны працоўны рытм. Што гадзіны і дні чакання бульбаўборачнага камбайна складаюцца ў казку аб страчаным часе. Што...

А ён адмахнуўся: «Тэхнікі не хапае.»

Мы абураліся. Калі даведаліся, што жыць будзем зусім не ўсе разам, а на кватэрах у гаспадынь чатырох(!) вёсак. Калі, прыйшоўшы аднойчы працаваць на ільняное поле, высвятлілі, што ў гэты дзень былі патрэбны на зернетаку. Калі...

Ён...

Зрэшты, якая яму справа да нашай нізкааплатнай работы і сярэдняга заробку каля дзесяці рублёў у месяц? Ён, хутчэй, прыкладаў намаганні, каб вынікаў сваёй працы мы так і не ўбачылі. Не абвяргаў справай выказванняў калгаснікаў: «Нашто спяшаецеся? Заробкі малыя. Адпачніце лепш ». Прапаноўваў прымірaючы варыянт: як ёсць, так і добра. І звяртацца ў райвыканком у далікатнай форме забараніў.

Не за грашыма мы ганяліся. Нават на тое, што разлічвалі нас у апошні перад ад'ездам дзень не пакрыўдзіліся б, калі б не жаданне наведаць бацькоў пакуль не пачаліся заняткі.

Праўда, ён, старшыня калгаса «Рассвет» Краснапольскага раёна П. П. Козел, за час знаёмства наўрад ці нас зразумеў.

Але ўрокі мы, студэнты першага курса журфака, усё ж атрымалі. Безгаспадарчасць, безадказнасць і беспакаранасць кіраўнікоў гаспадарак пануюць пакуль на «бульбе».

А. СУХАВЕРХІ,
студэнт І курса факультэта журналістыкі.

ПРАГУЛКА

АДЧУВАННЕМ УЛАСНАЙ НАДАКУЧЛІВАСЦІ СКОНЧЫЎСЯ ГЭТЫ ДЗЕНЬ.

Праз нейкі час мы даведаемся, што ў Дрычыне нас не чакалі і пашкадуем страчанага часу.

Пакуль жа, не маючы прычын для непакою, спяшаліся мы на дапамогу падшэфнаму саўгасу «Дрычынскі». Нас, атрад студэнтаў першага патоку першага курса геафака (а таксама будучых хімікаў, юрыстаў, журналістаў) не сустракалі. Адшуканы пасля доўгага бадзяння па палях і страты паловы «баявога» саставу (многія вярталіся назад, не вытрымаўшы выпрабавання холадам) брыгадзір здзіўлена-перапалохана разводзіў рукамі і перапытваў: «Што з вамі рабіць?» Каб жа мы ведалі!

Нагрузіўшы буракамі два прыцэпы, гадаючы да чыйго раўнадушша звяртацца за кампенсацыяй, мы пачулі ашаламляючую навіну. Мы, аказваецца, былі патрэбны ў другой брыгадзе, на станцыі «Новае сяло». Праўда, там забяспечаныя выязным буфетам, у прысутнасці прадстаўнікоў Маскоўскага райкома партыі і ДАІ з самай раніцы ўжо змагаліся за капусту 200—250 чалавек.

Нам пажадана было б ведаць:
— нашто нас запрасілі ў саўгас «Дрычынскі»;
— хто быў ініцыятарам і арганізатарам гэтай малапрыемнай прагулкі;
— хто будзе прасіць прабачэнне за сапсаваны настрой;
— хто адкажа за зрыў заняткаў на геафаку і іншых факультэтах?

І. П. СКВЯРНЮК.

ПРАПАНУЕМ... РАСКАШЭЛЬВАЦЦА

«БУЛЬБЕ» ПАТРЭБНЫ АДЗІН ГАСПАДАР

Хто толькі восеньскімі работамі ні займаецца! Кантралюем, абураемся, выдаем загады, а гаспадаром сітуацыі застаецца кіраўнік калгаса ці саўгаса. Ніякай матэрыяльнай адказнасці за парушэнне заключаных з атрадамі дагавораў гаспадаркі не нясуць. Выжывае на «бульбе» той, каму пашанцуе. Як, напрыклад, у гэтым годзе студэнтам філфака і біяфака. Дзякуючы руплівым клопатам дэканатаў, яны мелі і фронт работ, і прымальныя бытавыя ўмовы.

Арганізацыя сельгасработ на месцах з году ў год пагоршваецца. Эканамічная і выхаваўчая актыўнасць дзейнасці атрадаў падае.

Выйсце—ў доўгатэрміновых прамых сувязях факультэтаў з гаспадаркамі. А кіруючым і арганізуючым цэнтрам павінен стаць штаб працоўных спраў. Ці ў сельскагаспадарчых атрадах не такія ж камсамольцы працуюць, як у будаўнічых?

Кіраўнікі арганізацый, прымаючых восеньскія атрады, адразу адчулі б адказнасць. Знойдуць байцы непрымальнымі ўмовы пражывання і будуць мець поўнае права пакінуць гаспадарку. За вымушаныя прастоі нядбайнаму кіраўніку таксама давядзецца раскашэльвацца. Знікне імкненне да стварэння «гумавых» атрадаў, загадзя асуджаных на прастоі.

Нехта збіраецца на пошукі новых форм. Навошта яны патрэбны? «Бульба» — заканамерны працяг працоўнага семестра. Падрыхтоўка камандзіраў і камісараў, заключэнне дагавораў — звыклая для штабоў ЛСА справа.

Штаб працоўных спраў універсітэта за «бульбу» пакуль не хвалюецца. Непаразуменне гэтае выпраўляць патрэбна тэрмінова.

С. А. МАЛЕВІЧ,
прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню, намеснік камандзіра Рэспубліканскага студэнцкага атрада.

УСЯМУ СВОЙ ЧАС

АБЫСЦІСЯ БЕЗ СТУДЭНТАЎ — СПРАВА ДАЛЁКАЙ ПЕРСПЕКТЫВЫ. НЕ ЗВАЖАЦЬ НА ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС НЕЛЬГА ЎЖО СЁННЯ.

Адно і тое ж: далёкія ад нармальных бытавыя ўмовы, дрэннае харчаванне, нізкая эфектыўнасць працы студэнтаў... Колькі гадоў гэтым «класічным» фармулёўкам?

Недапушчальна. Безгаспадарча. І ўсё ж «бульба» застанецца справай звычайнай яшчэ гадоў на дзесяць. Пакуль студэнты, побач з другімі прыцягнутымі сіламі, з'яўляюцца на сутнасці асноўнай вытворчай адзінкай, якая забяспечвае ўборку ўраджаю. Адмаўленне — не выйсце. А вось аб разумнай арганізацыі: каб і вучэбны працэс не нёс страт, і калгасу студэнты былі на карысць, паклапаціцца не пашкодзіла б.

Адсутнічае: фронт работ. Гэта не выключэнне — правіла.

Дадзены: лішак колькасці студэнтаў і ранні тэрмін пачатку работ сельгасатрадаў.

Гаспадарнік упэўнены, што працоўных рук на яго долю хопіць, а студэнт з першага курса падрыхтаваны да самага горшага. У МГУ балючую «бульбяную» праблему даўно вырашылі і забыліся. Адпраўляючы на «бульбу» толькі адзін курс, маюць магчымасць кампенсаваць месяц, згублены ў яго раскладзе, дадатковымі заняткамі, засцерагаюць ад страт вучэбнага часу астатнія.

Трэба, каб студэнт (і той, што працаваў у будатрадзе, і той, што адпачываў летам) абавязкова ведаў: вучэбны год пачынаецца першага верасня, а на адным з курсаў пасля месяца сельскагаспадарчых работ. І не выратуюць тут ні адгаворкі, ні ўсялякія даведкі.

Вучэбны працэс не павінен падладжвацца пад акалічнасці. Аднак у сістэме «вучоба — дапамога сялу» пакуль адсутнічае ланцужок паразумення.

В. Ф. ЦІКАВЫ,
дэкан хімічнага факультэта.

Выпуск рыхтавалі М. ЗАГОРСКАЯ, Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.
Фотакалаж Сяргея ГРЫЦА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
1 снежня.
Зак. 1638.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.